Источник: "Наша слова" - 2014-01-29

Зайздросны лёс працаўніка беларускага моваазнаўства

(Да 90-годдзя прафесара А. Я. Баханькова)

Спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага моваазнаўца доктара філалагічных навук, прафесара, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Арцёма Яфімавіча Баханькова.

А.Я. Баханькоў нарадзіўся 29 студзеня 1924 года ў вёсцы Саламір'е Полацкага раёна Віцебскай вобласці. У 1941 годзе юнак закончыў сярэднюю школу і вымушаны быў уступіць у шэрагі партызанаў і падпольшчыкаў і ваяваць супраць нямецка-фашысціх захопнікаў, а потым далучыцца да байцоў Чырвонай Арміі і змагацца з ворагам на тэрыторыі Прыбалтыкі. За ратныя подзвігі Арцём Баханькоў быў узнагароджаны медалём "За адвагу", іншымі медалямі, ордэнам Айчыннай вайны.

Пасля вайны ён паступае вучыцца ў Полацкі педагагічны тэхнікум, па заканчэнні гэтай навучальнай установы некаторы час настаўнічае, а потым вучыцца ў Менскім педагагічным інстытуце на філалагічным факультэце. Скончыўшы педінстытут, А.Я. Баханькоў працуе настаўнікам у школах Полацкага раёна. Праз некаторы час ён паступае ў аспірантуру пры Менскім педагагічным інстытуце.

У час навучання ў аспірантуры пры Менскім дзяржаўным педагагічным інстытуце А. Баханькоў асабіста абследаваў дзясяткі населеных пунктаў берасцейска-пінскага Палесся, дзе зафіксаваў, сістэматызаваў, навукова апісаў і прааналізаваў вялікую колькасць моўнага матэрыялу, які датычыцца розных сінтаксічных канструкцый. Гэты навуковы аналіз выліўся ў падрыхтоўку кандыдацкай дысертацыі "Складаназалежны сказ у паўднёва-заходніх беларускіх гаворках", якую ён абараніў у 1961 годзе. Па гэтай праблеме ім апублікавана значная колькасць навуковых артыкулаў.

У 1960-1992 гадах А.Я. Баханькоў працаваў у Інстытуце моваазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. Асабліва плённымі былі 1960-1984 гады, калі ён быў укладальнікам, членам рэдкалегіі і рэдактарам 2-га тома пяцітомнага акадэмічнага "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы" (1977-1984). А.Я. Баханькоў з'яўляецца таксама суаўтарам акадэмічнага "Беларуска-рускага слоўніка" (т. 1-2; 1988-89).

У 1982 годзе ў акдэмічным выдавецтве "Навука і тэхніка" выйшла манаграфія А.Я. Баханькова "Развіццё лексікі беларускай літаратурнай мовы ў савецкі перыяд: Сацыялінгвістычны нарыс". У ёй аўтар прааналізаваў сацыяльна-эканамічныя і культурна-гістарычныя ўмовы, у якіх адбывалася фармаванне беларускай нацыі, паказаў залежнасць змяненняў у лексіцы ад сацыяльных і ўнутрымоўных фактараў, даследаваў крыніцы і шляхі ўзбагачэння лексікі новымі словамі: асваенне літаратурнай мовай лексічных багаццяў народных гаворак, выкарыстанне словаўтваральных і семантычных неалагізмаў, ажыўленне ўстарэлых слоў і запазычванне з іншых моў. Гэта манаграфія з'явілася базай для яго доктарскай дысертацыі, якую Арцём Яфімавіч абараніў у Спецыялізаваным савеце АН БССР у маі 1985 года.

Арцём Яфімавіч з'яўляецца ініцыятарам і арганізатарам падрыхтоўкі калектыўнай акадэмічнай манаграфіі "Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы". Гэта салідная праца выйшла ў свет у 1994 годзе ў акадэмічным выдавецтве "Навука і тэхніка" пад яго навуковай рэдакцыяй. Для гэтай манаграфіі А. Баханькоў напісаў вялікую ўступную частку і такія раздзелы працы, як "Спрадвечная лексіка беларускай мовы", "Лексіка перыяду беларускай народнасці", "Лексіка перыяду беларускай нацыі: дакастрычніцкі перыяд", "Лексіка перыяду беларускай нацыі: савецкі перыяд", "Парадыгматычныя адносіны ў лексіцы", "Характарыстыка асобных слоўных апазіцый у межах лексіка-семантычных катэгорый", а таксама "Заключэнне".

А. Баханькоў з'яўляецца таксама суаўтарам і адным з навуковых рэдактараў яшчэ адной акадэмічнай манаграфіі - "Гістарычнай лексікалогіі беларускай мовы" (1970), для якой ён падрыхтаваў раздзел "Змяненне лексікі беларускай мовы ў савецкі перыяд".

Раздзел А. Баханькова "Сінтаксіс скарынінскіх выданняў" увайшоў у яшчэ адну калектыўную акадэмічную манаграфію "450 год беларускага кнігадрукавання" (1968; с. 373-388).

Арцём Яфімавіч Баханькоў таксама плённа працаваў у галіне вучэбнай лексікаграфіі. Так, ён у суаўтарстве з І.М. Гайдукевічам і П.П. Шубам падрыхтаваў "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: Для сярэдняй школы" (Мінск, 1966; 2-е выд. - Мінск, 1972; 3-е выд. - Мінск, 1979 ; 4-е выд. - Мінск, 1990; 5-е выд., 1996). Гэтыя ж аўтары падрыхтавалі таксама "Толковый словарь русского языка: для средней школы" (Мінск, 1975 ; 2-е выд. - Мінск, 1985 ; 3-е выд. - Мінск. 1995). А.Я. Баханькоў, І.М. Гайдукевіч і П.П. Шуба падрыхтавалі і выдалі таксама: "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы": Каля 7800 найбольш распаўсюджаных слоў і выразаў (Мінск, 1998 ; 2-е выд. - Мінск, 2000; 3-е выд. - Мінск, 2006).

З 1992 года Арцём Яфімавіч Баханькоў - загадчык кафедры беларускай мовы пры прэзідыуме АН Беларусі. Ён арганізаваў і сфармаваў колькасны склад гэтай кафедры, куды, акрамя яго самога, увайшлі такія спецыялісты, як доктар філалагічных навук А.С. Аксамітаў, кандыдаты філалагічных навук Т.П. Бандарэнка, Г.Ф. Вештарт, Т.В. Кузьмянкова і інш. Каля 9 гадоў А.Я. Баханькоў кіраваў гэтай кафедрай. У 1995 годзе яму было прысвоена вучонае званне прафесара. Спецыялісты кафедры выкладалі і працягваюць выкладаць зараз курс беларускай мовы аспірантам НАН Беларусі ўсіх профіляў.

Доктар філалагічных навук, прафесар А.Я. Баханькоў на працягу доўгага часу працаваў на ніве беларускага моваазнаўства. Ён вызначаўся глыбінёй аналізу фактычнага матэрыялу, аналітызмам, комплексным падыходам пры вывучэнні канкрэтнай навуковай праблемы, удумлівасцю і прынцыповасцю. Ён шырока даследаваў лексіку беларускай мовы, дыялекталогію, гісторыю беларускай мовы, агульныя пытанні лексікалогіі і лексікаграфіі, напісаў і апублікаваў шмат прац энцыклапедычнага характару, актыўна адгукаўся ў друку рэцэнзіямі на навуковыя, навукова-метадычныя і лексікаграфічныя працы. З друку выйшла каля ста публікацый А.Я. Баханькова.

Ратны подзвіг Арцёма Баханькова ў гады Вялікай Айчыннай вайны і яго працоўна-навуковы шлях у мірны час з'яўляюцца яркай старонкай у жыцці роднай Беларусі і служыць добрым прыкладам для прадстаўнікоў маладзейшых пакаленняў людзей нашай дзяржавы.

На вялікі жаль, многае задуманае прафесарам А.Я. Баханьковым здзейснілася не да канца. Застаўся толькі ў картатэчным выглядзе "Слоўнік Палаччыны", які ён рыхтаваў разам з членам-карэспандэнтам НАН Беларусі М.Р. Суднікам. Не да канца сістэматызаванымі і прааналізаванымі засталіся матэрыялы неалагізмаў беларускай мовы, сабраныя А.Я. Баханьковым. Колькасна яны вылічаюцца больш чым дваццацю пяццю тысячамі моўных адзінак. Не лёсіла ажыццявіцца і некаторым іншым навуковым задумам і планам прафесара.

Пайшоў з зямнога жыцця Арцём Яфімавіч Баханькоў 12 жніўня 2001 года.

Мікалай Крыўко,
вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Мікалай Крыўко. Зайздросны лёс працаўніка беларускага моваазнаўства